УДК 94(476.5)

# ГІСТОРЫКІ ВІЦЕБСКА І ГІСТОРЫЯ ВІЦЕБСКА

**Півавар Мікалай Васільевіч , кандыдат гістарычных навук,
дацэнт, настаўнік гісторыі
Віцебскае кадэцкае вучылішча,
в. Лужасна, Рэспубліка Беларусь**

Ключавыя словы: гісторыя Віцебска, гісторыкі, краязнаўцы, лакальная гісторыя, славутыя землякі.

Рэферат. У артыкуле разглядаецца стан вывучэння гісторыі Віцебска мясцовымі даследчыкамі: выкладчыкамі вну, архівістамі, настаўнікамі, супрацоўнікамі музеяў, краязнаўцамі. Аналізуюцца асноўныя накірункі і гістарычныя зацікаўленасці даследчыкаў, якія вывучаюць розныя аспекты гісторыі і культуры рэгіянальнага цэнтра. Вылучаецца праблема адсутнасці дастатковай колькасці манаграфій, прысвечаных гісторыі горада. Робяцца разважанні аб тым, як палепшыць сітуацыю.

У кнізе Г. Карзенка «Гісторыкі Беларусі на пачатку XXI ст.»[1] змешчана кароткая інфармацыя пра больш 400 навукоўцаў краіны. Аднак у ёй ёсць інфармацыя толькі пра 3-х даследчыкаў з Віцебска: Я. Л. Гейльберга, А. У Русецкага, В. А. Космача.

З улікам вну, устаноў і арганізацый, у якіх працуюць асобы, якія маюць навуковыя ступені і званні, а тым болей настаўнікі, аматары гісторыі, якія валодаюць навуковай метадалогіяй займаюцца вывучэннем гісторыі на высокім узроўні гэта вельмі мала. Размова, верогодна можа ісці пра дзесяткі, а калі пашырыць крытэрыі вызначэння паняцця «гісторык» і пра сотні асоб [2].

А колькі ж ў Віцебску гісторыкаў? Які б накірунак гістарычнай навукі не вывучаў гісторык, якімі б тэмамі не займаўся, адной з самых важных з'яўляецца, на нашу думку вывучэнне гісторыі роднага горада (рэгіёна пражывання). Колькі ж іх гісторыкаў, якія звязаны жыццём з Віцебскам і прысвяцілі сваю дзейнасць вывучэнню менавіта гісторыі і розным аспектам жыцця горада?

Падрыхтаваць выданне, прысвечанае гісторыкам Віцебска (у шырокім сэнсе гэтага тэрміна), мы планавалі на 2018–2019 гг., але па шэрагу прычын праца над ім прыпынілася. Удалося толькі сабраць інфармацыю пра некаторых даследчыкаў, акцэнтаваць праблему і вызначыць асноўныя крытэрыі і перспектыўныя накірункі, якія патрабуюць распрацоўкі [3].

У гэтым артыкуле паспрабуем вызначыць, а хто з прафесійных гісторыкаў займаецца гісторый горада і Віцебскага рэгіёна.

Прааналізуем персаналіі па тэматычным прынцыпе.

**Археолагі.** Археолаг *Таццяна Станіславаўна Бубенька* (1957 г., г. Беразіно Мінскай вобл.), адна з тых даследчыкаў, дзейнасць якіх напрамую звязана з вывучэннем гісторыі горада. Праўда, толькі старажытнай. Ёй была прысвечана дысертацыя

навукоўцы, якую яна абараніла ў 1991 г., атрымаўшы навуковую ступень кандыдата гістарычных навук. На аснове дысертацыі і наступных даследаванняў была напісана кніга «Средневековый Витебск. Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV вв.)» [4]. Матэрыялы даследаванняў публікаваліся ў артыкулах у навуковых і навукова-папулярных выданнях [5–11].

Прыгадаем яшчэ дзвух археолагаў, якія не пражываюць у Віцебску, у выніку іх плённай працы паўсталі манаграфіі, якія мы абыйсці не можам. Калі Т. С. Бубенька вывучала пасад-ніжні замак сярэднявечнага Віцебска, Верхні замак Віцебска вывучаў археолаг – *Леанід Уладзіміравіч Калядзінскі* (1952 г., г. Мінск), к.г.н. (1991 г.), дацэнт (1999 г.). Ён абараніў кандыдацкую дысертацыю «Верхні замак Віцебска ў XI–XVIII стст.» (1991 г.). У 2024 г. выйшла манаграфія «Верхний замок Витебска (IX–XVIII вв.)» [6] у якой абагульнены вынікі археалагічных даследаванняз з 1977 па 1993 гг. Былі і дзесяткі артыкулаў прысвечаных археалогі Віцебска ў навуковым друку [2, с. 133–134].

Яшчэ адзін археолаг, які вывучаў Віцебск – *Вольга Мікалаеўна Ляўко* (1947–2021 гг.), к.г.н. (1980 г.), д.г.н. (2000 г.) усё жыццё адпрацавала ў інстытуце гісторыі. Вывучала гісторыю Віцебскай зямлі, матэрыяльную культуру XIV–XVIII стст. Даследавала старажытныя беларускія гарады (Віцебск, Оршу, Гарадок, Талачын, Копысь), замкі (Езярышча, Смальяны), Куцеінскі (Орша) і Святадухаўскі (Віцебск) манастыры, гарадзішчы, курганныя могільнікі, селішчы паўночна-ўсходняй Беларусі эпохі жалеза і сярэдневякоўя. Абараніла кандыдацкую дысертацыю «Витебск XIV–XVIII вв. (по археологическим данным)» (1980 г., навук. кіраўнік Штыхаў Г. В.), доктарскую дысертацыю «Формирование и развитие территориально-административных центров северо-восточной Беларуси в IX–XVIII стст.» (2000 г.), прадметам даследавання якой з’яўляецца фарміраванне і развіццё тэрытарыяльна-адміністрацыйных цэнтраў Усходняй Віцебшчыны перыяду сярэднявечча. Аўтар шматлікіх артыкулаў ў навуковым і перыядычным друку на тэмы археалогіі і матэрыяльнай культуры Віцебшчыны. З’яўлялася аўтарам кніг: «Витебские изразцы XIV–XVIII вв.», «Витебск XIV–XVIII вв.», «Экскурсия по древнему Витебску», «Торговые связи Витебска в X–XVIII вв.», «Средневековое гончарство северо-восточной Белоруссии», «Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: Формирование и развитие» [13–18]. Асобна адзначым апошнюю – «Витебск» [19]. У сувязі з абмежаванымі аб’ёмамі дадзенага артыкула, поўную бібліяграфію аўтара ў навуковым друку пералічваць не будзем.

**Выкладчыкі вну.** *Яўген Аляксандравіч Грэбень* (1977 г., г. Віцебск), к.г.н. (2005 г.), дацэнт (2008 г.) вывучае штодзённасць у часы Другой сусветнай вайны. У шэрагу артыкулаў у навуковым друку ён апублікаваў матэрыялы такіх даследаванняў па Віцебску. *Аляксей Віктаравіч Бяляеў* (1974 г., г. Віцебск), к.г.н. (2005 г.), дацэнт (2009 г.) даследаваў дзейнасць Віцебскай гарадской управы ў гады акупацыі (1941–1944 гг.). Вынікі даследаванняў апублікаваў у кнізе «Памяць» г. Віцебска [20] і зборніках канферэнцый [10]. *Максім Дзмітрыевіч Макараў* (1976 г., г. Віцебск), к.г.н. займаецца пытаннямі медыявістыкі. Аўтар некалькіх кніг і шэрагу артыкулаў

[2, с. 199 ].

Гісторык, к.г.н. *Генадзь Аляксандравіч Грэчкін* (1928 г., Ула Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобл.) у 1958 г. абараніў дысертацыю «Борьба за установление советской власти в Витебской губернии» [21].

*Аляксандр Леанідавіч Дзядзінкін* (1978 г., г. Віцебск), к.г.н. (2004 г.), дацэнт (2006 г.) у дачыненні да гісторыі Віцебска вывучае нацыянальную палітыку савецкай улады і гісторыю нацыянальных меншасцяў [12]. Загадчык кафедры ВДУ імя П.М. Машэрава *Анатоль Мікалаевіч Дулаў* (27.01.1978 г., г. Віцебск), к.г.н. (2006 г.), дацэнт (2010 г.) у дачыненні да гісторыі Віцебска даследуе асобныя пытанні крыніцазнаўства, легендарнага заснавання г. Віцебска. Розныя аспекты гісторыі і культуры Віцебска асвятляе у сваіх артыкулах *Тацццяна Пятроўна Іванова* (Казлова) (24.11.1961 г., г. Віцебск), к.г.н (2008 г.), дацэнт (2010 г.).

У межах сваіх дысертацыйных дласледаванняў вывучалі і публікавалі матэрыялы выкладчыкі тэхнагалічнага універсітэта *Алякандр Аляксандравіч Субоцін*, к.г.н. (2019 г.), *Віктар Мамертавіч Хаданёнак* к.г.н. (2014 г.), дацэнт (2016 г.).

Асобая роля ў асвятленні падзей Вялікай Айчыннай вайны ў г. Віцебске належыць к.г.н. (1968 г.), дацэнту (1971 г.) *Ніне Іванаўне Дарафеенка* (Маісеевай) (1923–2015 гг.). Яе дысертацыя, прысвечаная віцебскаму падполлю была надрукавана ў выглядзе кнігі «Витебское подполье». Другая кніга – «Юные герои Витебщины» [13]. Публікавала яна артыкулы на розныя тэмы з гісторыі Віцебшчыны [14].

Пытанні **культурнага жыцця** Віцебска сталі асноўнай тэмай даследаванняў некалькіх гісторыкаў – А. У Русецкага, Т. М. Катовіч, А. Г. Лісава. *Аркадзь Уладзіміравіч Русецкі* (1942–2021 гг.), к.ф.н. (1978 г.), д.г.н. (1990 г.), прафесар (1996 г.) на грунтоўным узроўні вывучаў розныя аспекты гэтай тэмы і стаў аўтарам некалькіх соцень артыкулаў у навуковым і перыядычным друку, а таксама шэрагу манаграфій: «Художественная культура Витебска в позднем средневековье» (1995); «Вывучаць і ведаць гісторыю Віцебска» (2000 г.), «Художественная культура Витебска с древности до 1917 года» (2001 г.), «Ученые-уроженцы Витебщины – для инноваций Беларуси» (2007 г.), «Художественная культура Витебщины: Поозерье, Подвинье, Верхнее Поднепровье / в контексте восточно-славянских и западно-европейских культурных процессов» (2008 г.) і др. [15]. Суаўтарам многіх манаграфій з'яўляецца *Юрый Аркадзевіч Русецкі* (1969 г.) к.г.н. (2004 г.), дацэнт (2006 г.). Асабліва адзначым яго дысертацыю, прысвечаную культуры Віцебска ў канцы XVIII–пач. XIX ст. [24–29].

Мастацтвазнаўца, педагог *Тацццяна Віктараўна Катовіч* (1954 г., г. Віцебск), доктар мастацтвазнаўства (2008 г.), прафесар – прызнаны аўтарытэт у галіне гісторыі культурнага жыцця Віцебска. Спіс яе прац прысвечаных Віцебску настолькі вялікі, што не можа быць змешчаны ў межах дадзенай публікацы, а сам даследчык варты асобнага артыкула. Прывядзем толькі некалькі выданняў аўтара: «Театральная культура Витебщины XX века», «Сценография. Витебск», «Белорусский театр «Лялька»», «Новый Художественный театр» [30].

Вывучэннем мастацкай культуры Віцебска XIX–XX стст., у першую чаргу дзейнасцю віцебскай мастацкай школы займаецца *Аляксандр Генадзевіч Лісаў*

(1959 г., г. Шчучын Гродзенскай вобл.), кандыдат мастацтвазнаўства (1998 г.), дацэнт (2004 г.). Асаблівую ўвагу надае і краязнаўчым даследаванням краю. Ён аўтар і сааўтар некалькіх кніг: «Художник Исаак Боровский» (1997 г.), «Краязнавец Мікалай / Каспяровіч» (2000 г.), «Сапуновские места Витебска и окрестностей» (2004 г.), «Историк В. Вейгер-Рейдемейстер» (2004 г.) [31–34].

Беларускі гісторык архітэктуры *Тамара Ігнатаўна Чарняўская* (1934 г., г. Масква), кандыдат архітэктуры (1967 г.) зрабіла вялізны ўклад у вывучэнне гісторыі і культуры горада, стаўшы аўтарам кнігі «Архітэктура Віцебска» [35], артыкулаў прысвечаных Віцебску ў «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі», «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць» (22 артыкула).

Навуковыя інтарэсы былога выкладчыка ВДУ імя П. М. Машэрава *Галіны Мікалаеўны Якаўлевай* (1954 г.), к.г.н. (1988 г.), дацэнт (1997 г.) датычацца гісторыі СССР і БССР 1920–1940-х гг.; гендэрнай гісторыі. Некаторыя артыкулы навукоўцы прысвечаны розным бакам жыцця Віцебска вылучаюцца грунтоўнасцю падрыхтоўкі і добрым стылем выкладання [36–39].

**Архівісты.** Архівіст, партыйны работнік, гісторык *Тамара Іванаўна Глінка* (1933 г., г. Віцебск) вывучала гісторыю савецкіх пераўтварэнняў і падзеі Вялікай Айчыннай вайны на Віцебшчыне. З'яўлялася адным з аўтараў выдадзеных архівам альбома і кнігі «Юныя героі Віцебшчыны» [23]. *Тамара Нікіфараўна Касцянюк* (1939 г., г. Віцебск) у 1970–1980-я гг. актыўна выступала на старонках мясцовых СМІ з асвятленнем розных бакоў савецкага жыцця горада, стала суаўтарам альбома, прысвечанага ўдзельнікам усталявання савецкай улады на Віцебшчыне «Призванные Октябрем».

Супрацоўнік Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці – *Канстанцін Рыгоравіч Карпекін* (1985 г., в. Якубаўшчына Лёзненскага раёна Віцебскай вобл), к.г.н. (2013 г.), у сваіх даследаваннях надае перавагу вывучэнням пытанняў іўдаікі, у тым ліку ў на Віцебшчыне. *Святлана Мясаедава* (1975 г.) – аўтар шэрагу артыкулаў у навуковым і перыядычным друку, прысвечаных розным аспектам гісторыі горада. *Міхаіл Уладзіміравіч Пішчулёнак* (1953–2008 гг.), к.г.н. (1990 г.) вывучаў розныя аспекты архіўнай справы, праваслаўнай царквы ў XX ст., Вялікай Айчыннай вайны на Віцебшчыне. Навуковая спадчына даследчыка размешчана галоўным чынам у артыкулах у навуковым друку і старонках СМІ [40–43].

Асобна вызначым постаць гісторыка, педагога, дзяржаўнага служачага *Дзяніса Валер'евіча Юрчака* (1981 г., в. Перамонт Лёзненскага раёна Віцебскай вобл), к.г.н. (2015 г.), дацэнт (2017 г.), які вельмі актыўна займаецца папулярызацыяй гісторыі горада. Ён пастаянны вядучы курсаў прысвечаных гісторыі горада, перадач, прамых эфіраў, якія праводзяцца на Віцебскім тэлебачанні. Сфера яго зацікаўленняў вельмі шырокая – ад археалогіі і гістарычнай рэканструкцыі, да падзей Вялікай Айчыннай вайны і стану гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Асобную ролю ў вывучэнні гісторыі горада займаюць **краязнаўцы**. Іх уклад цяжка пераацаніць і можна прысвяціць асобны артыкул. Толькі пералічым імёны

І. А. Абрамавай, А. М. Падліпскага (1946 г., г. Віцебск), Л. У. Хмяльніцкай (1961 г., г. Віцебск), В. А. Шышанава (1966 г., г. Віцебск) і іншых

Вывады. Гісторыяй Віцебска ў межах сваёй тэмы займаюцца дзесяткі гісторыкаў. Але грунтоўна, каб вынікамі даследаванняў былі выдадзеныя манаграфіі толькі археолагі – Т. С. Бубенька, Л. У. Калядзінскі, В. М. Ляўко, а таксама гісторыкі, якія вывучаюць пытанні культурнага жыцця горада – Т. М. Катовіч, А. Г. Лісаў, А. У. Русецкі. М. Макараў вывучае гісторыю сярэднявечнага Віцебска.

Больш дасканала лакальную гісторыю горада вывучаюць краязнаўцы, у першую чаргу – А. М. Падліпскі, В. А. Шышанаў, І. А. Абрамава, Л. Хмяльніцкая і іншыя.

Аднак пакуль манаграфіі ці комплекснага даследавання, прысвечанага гісторыі горада не створана. Няма і добрага комплекснага пуцяводніка па гораду. Гісторыкам, педагогам, архівістам, навукоўцам варта звярнуць больш увагу на гісторыю горада Віцебска.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Корзенко, Г. В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник / Г. В. Корзенко. – Мн. : Белорус. наука, 2007. – 470 с.

2. Півавар, М. В. Краязнаўцы Віцебшчыны 2-й пал. XX – пач. XXI ст. / М. В. Півавар. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – 372 с.

3. Півавар, М. В. Гісторыкі Віцебска 2-й паловы XX – пач. XXI ст.: да канцэпцыі выдання / М. В. Півавар // Актуальные вопросы изучения и преподавания истории, социально-гуманитарных дисциплин и права. – Витебск : ВГУ, 2018. – С. 106–107.

4. Бубенько, Т. С. Средневековый Витебск. Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.): монография / Т. С. Бубенько. – Витебск : Изд-во УО «ВГУ им. П. М. Машерова», 2004. – 276 с.

5. Бубенько, Т. С. Посад Витебска X – первой половины XIV в. (по материалам исследований Нижнего замка): Автореф. дисс... канд. ист. наук / Т. С. Бубенько. – Л., 1991.

6. Бубенька, Т. С. Жыллё феадальнага Віцебска / Т. С. Бубенька // З глыбі вякоў. Наш край: Гісторыка-культуралагічны зборнік. – Мн. : Навука і тэхніка, 1992. – С. 46–68.

7. Бубенька, Т. С. Крыж XVI ст. з Віцебска / Т. С. Бубенька // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння. – Мн. : Навука і тэхніка, 1994. – С. 245–248.

8. Бубенько, Т. С. Планировка и застройка посада средневекового Витебска (X–XIV вв.) / Т. С. Бубенько // Гісторыка-археалагічны зборнік. – 1996. – № 8. – С. 57–65.

9. Бубенько, Т. С. Кожаная обувь средневекового Витебска XII–XVIII вв. (по материалам исследований Нижнего замка) / Т. С. Бубенько // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі. Новыя матэрыялы і даследаванні. – Мн. : Навука і тэхніка, 1993. – С. 127–131.

10. Бубенько, Т. С. Площадь 1000-летия Витебска: итоги исследований и перспективы благоустройства / Т. С. Бубенько // 90 год Віцебскаму абласному

краязнаўчаму музею: матэрыялы навук. канф. – Мн. : Медысонт, 2009. – С. 30–37.

11. Бубенька, Т. С. Да пытання аб лакалізацыі царквы Святой Праскевы Пятніцы ў Віцебску / Т. С. Бубенька // Віцебскі сшытак. – 1995. – № 1. – С. 5–7.

12. Колединский, Л. В. Верхний замок Витебска (IX–XVIII вв.) / Л. В. Колединский. – Гродно : «ЮрСаПринт», 2021. – 632 с.

13. Левко, О. Н. Витебские изразцы XIV–XVIII вв. – Мн. : Наука и техника, 1981. – 46 с.

14. Левко, О. Н. Витебск XIV–XVIII вв. / О. Н. Левко. – Мн.: Наука и техника, 1984. – 120 с.

15. Левко, О. Н. Экскурсия по древнему Витебску / О. Н. Левко. – Мн. : Полымя, 1984. – 32 с.

16. Левко, О. Н. Торговые связи Витебска в X–XVIII вв. / О. Н. Левко. – Мн. : Наука и техника, 1989. – 85 с.

17. Левко, О. Н. Средневековое гончарство северо-восточной Белоруссии / О. Н. Левко. – Мн.: Наука и техника, 1992. – 63 с.

18. Левко, О. Н. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: Формирование и развитие / О. Н. Левко. – Мн. : Бел. навука, 2004. – 280 с.

19. Левко, О. Н. Витебск / О. Н. Левко. – Мн.: Бел. навука, 2010. – 335 с.

20. Бяляеў, А. В. Цяжкія гады акупацыі / А. В. Бяляеў // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка. Віцебск : у 2-х кн. – Кн. 1. – Мн.: БелЭн, 2002. – С. 425–431.

21. Гречкин, Г. А. Борьба за установление советской власти в Витебской губернии / Г. А. Гречкин. – Витебск : Типография им. Коминтерна, 1958. – 72 с.

22. Дорофеенко, Н. И. Витебское подполье / Н. И. Дорофеенко, Н. И. Пахомов, Н. И. Дарафеенка. – Мн. : Беларусь, 1974. – 248 с.

23. Дорофеенко, Н. И. Юные герои Витебщины / Н. И. Дорофеенко, В. Г. Скопа, Т. И. Глинка, Г. М. Акенцев. – Мн.: Народная асвета, 1980. – 127 с.

24. Русецкий, А. В. Художественная культура Витебска в позднем средневековье / А. В. Русецкий. – Витебск, 1995.

25. Русецкі, А. У. Вывучаць і ведаць гісторыю Віцебска / А. У. Русецкі. – Віцебск : друкарня ВДУ, 2000. – 38 с.

26. Русецкий, А. В. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года / А. В. Русецкий, Ю. А. Русецкий. – Мн. : БелЭн., 2001. – 288 с.

27. Русецкий, А. В. Ученые-уроженцы Витебщины – для инноваций Беларуси / А. В. Русецкий. – Витебск: изд. центр ВГУ им. П. М. Машерова, 2007. – 144 с.

28. Русецкий, А. В. Художественная культура Витебщины: Поозерье, Подвинье, Верхнее Поднепровье / в контексте восточно-славянских и западно-европейских культурных процессов / А. В. Русецкий. – Витебск : выдавецтва ВДУ имя П. М. Машэрва, 2008. – 540 с.

29. Русецкий, Ю. А. Культурное развитие Витебска в последней четверти XVIII – 30-х годах XIX столетия : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Ю. А. Русецкий. – Минск, 2003. – 22 с.

30. Татьяна Викторовна Котович: Библиографический указатель / Витебская областная библиотека имени В. И. Ленина, отдел литературы по искусству; Редколлегия: Т. Н. Адамян (ответственный редактор) и др. – Витебск : Витебская областная библиотека, 2009. – 123 с.

31. Лисов, А. Г. Художник Исаак Боровский / А. Г. Лисов. – Витебск : Витебский краеведческий фонд им. А. П. Сапунова, 1997. – 80 с.

32. Лісаў, А. Г. Краязнавец Мікалай Каспяровіч / А. Г. Лісаў, А. М. Падліпскі. – Віцебск : ВАД, 2000. – 48 с.

33. Лисов, А. Г. Сапуновские места Витебска и окрестностей / А. Г. Лисов, А. М. Полипский. – Витебск : Обл. тип., 2004. – 48 с.

34. Лисов, А. Г. Историк В. Вейгер-Рейдемейстер / А. Г. Лисов. – Витебск : Обл. тип., 2004. – 32 с.

35. Чарняўская, Т. І. Архітектура Віцебска: З гісторыі планіроўкі і забудовы горада / Т. І. Чарняўская. – Мн. : «Навука і тэхніка», 1980. – 112 с.

36. Яковлева, Г. Н. Латышский клуб как один из центров общественно-политической и культурной жизни г. Витебска в первые годы советской власти / Г. Н. Яковлева // LATGALE KA KULTURAS PIEROBEZA. Daugavpils: Daugavpils Universitates Akademiskais apgads "Saule", 2008. – P. 267–277.

37. Яковлева, Г. Н. Повседневная жизнь жителей города Витебска в период немецкой оккупации (1941–1944 гг.) / Г. Н. Яковлева // Известия Гомельского государственного университета им. Ф.Скорины. – №4 (55). – Ч. 1. – С. 163–168.

38. Яковлева, Г. Н. Некоторые аспекты политической жизни Витебска в 1919 г. / Г. Н. Яковлева // Грамадскія рухі і палітычныя партыі у Беларусі (апошняя чвэрць XIX – пачатак XX стст. ) : мат. Рэсп. навук. канф. (Гродна, 23-24 кастр. 2008 г.) – Гродна : ГрДУ, 2009. – С. 141–145.

39. Яковлева, Г. Н. Борьба за новый советский быт на Витебщине в постреволюционный период / Г. Н. Яковлева // Романовские чтения. – 6 (к 75-летию истфака УО «МГУ им. А. А Кулешова»): сб. статей международной конференции. – Могилев: УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2010. – С. 188–189.

40. Пищулёнок, М. В. Православная церковь на Витебщине в 1920-х – начале 1930-х годов (по материалам ГАВО) / М. В. Пищулёнок // Веснік ВДУ – 1996. – № 1. – С. 12–16;

41. Пішчулёнак, М. В. Забойства Пэна. Афіцыйная версія / М. В. Пішчулёнак // Зборнік выступленняў на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю Віцебскай мастацкай школы. – Наваполацк: Наваполацкая друкарня, 1997. – С. 63–66.

42. Пищулёнок, М. В. Архивисты Витебской области учатся зарабатывать деньги / М. В. Пищулёнок // Архівы і справаводства. – 2001. – № 3. – С. 78–83.

43. Пішчулёнак, М. В. Віцебшчына архіўная (Да 150-годдзя ўтварэння першага дзяржаўнага архіва ў Беларусі) / М. В. Пішчулёнак // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 4. – С. 30–36.